**Башарымаў, М.** Дзе грукат камянёў… / М. Башарымаў // Сцяг Ільіча (Талачын). — 1991. — 5 сак. — С. 2.

## ДЗЕ ГРУКАТ КАМЯНЁЎ…



Калі шматтонны БелАЗ пачынае звальваць у драбілку нярудныя матэрыялы, сярод якіх трапляюцца камяні вагой больш чым па сто кілаграмаў, узнікае такое грукатанне, што хоць вушы затыкай.

– Нібы артылерыя ўсімі сваімі ствaламі дзейнічае ў гарах, – усміхаецца Аляксандр Самасейка.

Па-вайсковаму падцягнуты, стройны, з адкрытым позіркам, ён неяк адразу прываблівае да сябе.

– Ды Аляксандр яшчэ якіх пяць гадоў назад у арміі, у Афганістане служыў, – зазначыў дырэктар гравійна-пясчанага кар'ера А. К. Некрашэвіч, які прыехаў разам з намі да драбілкі. – Дарэчы, у артылерыі і, дарэчы, медалём «За адвагу» ўзнагароджаны.

З павагай паглядзелі мы на Аляксандра. Ведаем, якія суровыя выпрабаванні выпалі нашым юнакам у Афганістане. Прайшоў, выходзіць, праз іх беларускі юнак Саша Самасейка, не хаваўся за спіны іншых у мінуты смяртэльнай небяспекі, інакш не быў бы ўдастоены медаля «За адвагу», які ў гады Вялікай Айчыннай вайны прыраўноўваўся да ордэна.

– А там і нельга было схавацца ад небяспекі, – нібы разгадвае мае думкі Аляксандр. – Там перамагчы, а, значыць, і выжыць можна было толькі дзейнічаючы з'яднана, як адно цэлае...

Ён задумваецца на некалькі хвілін, можа перанёсшыся думкамі туды, у горы Афганістана, у баявыя будні сваёй часці, дзе гартаваліся баявое братэрства і характар самога Аляксандра.

Нялёгкую ношку ўзваліў ён на свае не такія ўжо і шырокія плечы, калі пасля дэмабілізацыі, папрацаваўшы крыху на аршанскім мехзаводзе, прыйшоў сюды, на гравійна-пясчаны кар'ер, стаў драбільшчыкам.

– У абавязкі Аляксандра ўваходзіць кіраванне працэсам здрабнення і падачы нярудных мэтэрыялаў на галоўны канвеер, – так крыху мудрагеліста выразіўся дырэктар ГПК А. К. Некрашэвіч.

Рэальна ж гэта выглядае так. Невялікі буданчык, у якім Аляксандр Самасейка можа адпачыць і схавацца ад непагадзі. І за ім, буданчыкам, пад паветкай з шыферу, – яго рабочае месца. Мосцікі, металічныя лесвіцы, па якіх можна спусціцца ніжэй самой драбілкі. Электрарухавікі, найбольш магутны з якіх і варочае самую драбілку. Няцяжка ўявіць, з якім скрыгатаннем раздрабляюцца камяні, каб потым легчы на транспарцёр і разам з пяском, гравіем рушыць па транспарцёру наверх, да галоўнага канвеера.

А пачынаецца ўвесь цыкл работ з выгрузкі нярудных матэрыялаў у так званы бункер, частка з якіх правальваецца праз шчыліны ўніз. Астатнія ідуць на драбілку. Але нярэдка трапляюцца камяні такога аб'ёму, што ў драбілку не пралазяць. Іх Аляксандр Самасейка з дапамогай тэльфера, часцей усяго прыкладаючы і свае фізічныя намаганні, выкідвае ўбок.

Мы бачылі цэлы груд такіх выкінутых камянёў, ляжаўшых, нібы сонныя бараны, крыху воддалі драбілкі. Паспрабавалі падняць доўгі, у некалькі метраў, металічны прэнт з прыстасаваннем на канцы, без якога Аляксандр таксама не абыходзіцца ў рабоце. Моцна пацягнуў ён рукі ўніз...

– Аляксандр яшчэ і пастаянна сочыць за сваім рабочым месцам, за механізмамі, ачысткай бункера, рэгуліроўкай канвеера, змазкай мацаванняў і іншым, – расказваў А. К. Некрашэвіч, з вясёлай усмешкай назіраючы, як мы з фотакарэспандэнтам, уявіўшы сябе на месцы драбільшчыка, яшчэ і яшчэ раз рабілі спробу папрацаваць з тым важкім металічным прэнтам.

А, між тым, Аляксандр Самасейка спраўляецца з ім даволі лёгка і жвава. Вось вам і «не такія ўжо шырокія плечы...».

– Аляксандр Самасейка з тых, пра каго гавораць «чалавек цвёрдай жыццёвай пазіцыі», ён – наш гонар, – з пачуццём павагі працягваў А. К. Некрашэвіч. – На такіх, як ён, можна пакласціся. І сем'янін Саша што трэба. Вельмі любіць сваіх сыноў, старэйшаму з якіх, Максімку, у маі споўніцца пяць гадоў, а малодшаму, Антошку, – яшчэ толькі годзік.

...Плылі над кар'ерам рэдкія белыя аблачынкі, па бясконцых дарогах яго, нібы па вуліцах пасёлка, насіліся аўтамашыны. Гравійна-пясчаны кар'ер жыў сваім звыклым жыццём. А я думаў пра Аляксандра Мікалаевіча Самасейку, з якім толькі што пазнаёміўся, былога «афганца», які выбраў сабе нялёгкую прафесію драбільшчыка і які верна служыць ёй.

**М. Башарымаў**

На здымку: А. Самасейка на сваім рабочым месцы

Фота Л. Скарупы